«Вясна» — экстрэмісцкае фармаванне.
Што трэба ведаць?

Падтрымай "Вясну" на PATREON

Абаронцу Курапатаў Урбановічу прысудзілі буйны штраф

27.03.2019 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Дзяніс Урбановіч у міліцэйскай машыне. Фота "Новы час"

Картка працэсу:

Суд: Мінскага раёна

Суддзя: Віктар Шаўцоў

Асоба, у дачыненні да якой вядзецца працэс: Дзяніс Урбановіч

Артыкул: 17.11 КаАП (дробнае хуліганства) і 23.4 (непадпарадкаванні супрацоўнікам міліцыі)

Рашэнне: штраф 50 базавых велічыняў (1275 бел. руб.)

Суд Мінскага раёна ўвечары 26 сакавіка разглядзеў адміністрацыйную справу супраць абаронцы Курапатаў **Дзяніса Урбановіча**. Яго вінавацяць у “дробным хуліганстве” (арт. 17.11 КаАП) і “непадпарадкаванні супрацоўнікам міліцыі” (арт. 23.4 КаАП). Суддзя - **Віктар Шаўцоў**, а сведкай выступіў міліцыянер **Кніга**.

Негледзячы на тое, што Ўрбановіч не прызнаў віну ў абодвух правапарушэннях, суд аштрафаваў яго ў сукупнасці на **50 базавых велічыняў**, што складае 1275 рублёў.

Нагадаем, Дзяніс Урбановіч быў затрыманы разам з **Валерыем Рабцавым** увечары 25 сакавіка. Як піша "Новы час", гэта адбылося неўзабаве пасля малітвы і запалення знічак. Падчас затрымання Дзяніс Урбановіч заявіў, што добраахвотна ў машыну не пойдзе — тады міліцыянты яго занеслі на руках. Паведамляецца, што іх павезлі ў Бараўлянскі РУУС.

Пазней Валерыя Рабцава адпусцілі, а Дзяніса Урбановіча на ноч змясцілі ў ІЧУ.

Артыкулы, па якіх складзеныя пратаколы:

Паказваць 10 запісаў

Пошук:

Імя	Артыкул	Дата суда	Судзьдзя	Суд	
Урбановіч Дзяніс	19.1 КаАП – «дробнае хуліганства» (былы 17.1), 24.3 КаАП – «непадпарадкаваньне законным патрабаваньням службовай асобы» (былы 23.4)	2019-03-26	Шаўцоў Віктар	Менск, раённы	5 1
Урбановіч Дзяніс	24.3 КаАП – «непадпарадкаваньне законным патрабаваньням службовай асобы» (былы 23.4)	2019-02-26	Шаўцоў Віктар	Менск, раённы	4 1
	18.20 КаАП – «Парушэнне правілаў дарожнага руху			Менская	

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Праваабаронцы рыхтуюць дапаможнік пра мірныя сходы для беларусаў і беларусак замежжа

Палітзняволеную ўраджэнку Украіны асудзілі па "справе карагодаў" у Брэсце

"Тое, што зрабіў Раман Бандарэнка — гэта выбар асобы". Сведчанні ўдзельнікаў акцыі памяці на Плошчы Пераменаў

"Раман у дваццатым калене, выходзь!" Памяці Рамана Бандарэнкі

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Пусціўся ў слэм пад "Груз", а ў галаве — ўспаміны пра тыдзень у халодным ШІЗА..." Вялікая размова з экс-следчым, асуджаным па "справе карагодаў"

У анкахворага палітвязня прагрэсуе хвароба. Ён праходзіць курсы хіміятэрапіі ў турэмнай лякарні

Агляд навінаў палітвязняў з 27 лістапада па 5 снежня

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Без канкрэтных доказаў мы можам застацца непачутымі". Што важна ведаць пра незалежнае назіранне за выбарамі*

Палітзняволеныя вясноўцы ў "спісе экстрэмістаў": хроніка пераследу 7-8 снежня

У анкахворага палітвязня прагрэсуе хвароба. Ён праходзіць курсы хіміятэрапіі ў турэмнай лякарні

Заява аб прызнанні 22 новых палітычных зняволеных

#FreeViasna ўзяла ўдзел у адвэнт-маркеце мерапрыемства "Беларусь у/і Еўропе"

Мінчука асудзілі за сарваны са сцяны інтэрната дзяржаўны сцяг

Праваабаронцы рыхтуюць дапаможнік пра мірныя сходы для

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Лістапад 2023







ПАРТНЁРСТВА



















СЯБРОЎСТВА







E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

